# ЭКЗАТЫЧНЫЯ ЎСХОДНІЯ МАТЫВЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ТРАДЦЫЙНЫМ МАСТАЦТВЕ: НА ПРЫКЛАДЗЕ АРНІТАМОРФНЫХ ВОБРАЗАЎ

**М.Л. Карпянкова**

*Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці,*
*Гікала, 4, 220005, г. Мінск, Беларусь, m.l.karpenkova@gmail.com*

У артыкуле разглядаецца інтэрпрэтацыя і гісторыя ўжывання экзатычных орнітаморфных вобразаў у беларускім народым роспісу на шкле, жанравай насценнай вышыўцы, маляваных дыванах, насценным інтэр'ерным роспісу. Усходнія орнітаморфныя матывы перш за ўсё з'яўляліся адным з элементаў комплекснага аздаблення пераважна сялянскага, але часам і гарадскога інтэр'ера. Сярод выяў экзатычных птушак у XX ст. папулярнасцю карысталіся сюжэты з паўлінамі і папугаямі. Гэтыя прыклады разглядаюцца ў ракурсе актыўнага ўзаемпранікнення гарадской і сельскай культуры, якое адбывалася на тэрыторыі ўсяго Савецкага саюзу ў 1950-е гг.

***Ключавыя словы:*** усходнія матывы; арнітаморфныя вобразы; паўлін; папугай; вышыўка; роспіс на шкле; размаляваны дыван, сярэдзіна XX стагоддзя.

# EXOTIC ORIENTAL MOTIFS IN THE BELARUSIAN TRADITIONAL ART: BY THE EXAMPLE OF ORNITHOMORPHIC IMAGES

**M.L. Karpiankova**

*Minsk Regional Center of Folk Art,*
*Gikala, 4, 220005, Minsk, Belarus, m.l.karpenkova@gmail.com*

The article deals with the interpretation and history of the use of exotic ornithomorphic images in the Belarusian folk painting on glass, genre wall embroidery, carpets with paintings, wall paintings in the interior. Oriental ornithomorphic images were one of the elements in the decor of rural and less often urban interiors. Among the images of exotic birds in the 20th century there were popular subjects with peacocks and parrots. These examples were considered from the perspective of the active interpenetration of rural and urban cultures on the territory of the Soviet Union in the 1950s.

***Keywords:*** oriental motifs; ornithomorphic images; peacock; parrot; embroidery; painting on glass; painted carpet, mid-twentieth century.

У якасці базы крыніц для артыкула была вывучана экспазіцыя выставы «Відзікі: беларускі традыцыйны роспіс на шкле» ў галерэі «Цэнтр» дзяржаўнай установы «Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці», экспазіцыя залаў дзяржаўнай установы культуры «Мотальскі

музей народнай творчасці», а таксама прадукцыя 1950-х гг. Тыпаграфіі імя Сталіна г. Мінска (інтэрнэт-аукцыёны).

У 1950-е гг. паступова нараджаюцца новыя сацыяльна-бытавыя традыцыі. На гэтым фоне цікавымі выглядаюць прыклады асіміляцыі ўсходніх экзатычных матываў і уключыэнне іх у беларускую народную культуру ХХ ст.

Што датычыцца ўвогуле арнітаморфных вобразаў, то ў творах народнага мастатцтва — вышыўцы і розных відах роспісу сустракаюцца наступныя: галубы (пераважна парныя выявы), лебедзі, а таксама, як сімвал нечага недасягальнага і райскага — паўліны і папугаі. Маляваныя дываны і «карцінкі» на шкле з выявамі птушак вельмі часта дарылі на вяселле ў якасці пэўнага абярэга «на шчасце».

Што датычыцца старажытанай семантыкі менавіта выяў паўліна і папугая, то яна бярэ свае карані ў краінах Усходу. У культуры Індыі паўлін мае двоісную семантыку: веліч, гордасць, але і славалюбства. Паўлін, з распрастаным хвастом, азначае Сонца, якое ўсё бачыць. У культуры Візантыі паўлін лічыўся царскай птушкай.

Паўлін – хрысціянскі сімвал бессмяротнасці і ўваскрэсення Хрыста, «райская птушка», якая сімвалізуе нятленнасць душы. Падобную сімволіку ён атрымаў дзякуючы антычным уяўленням аб тым, што мяса гэтай птушкі не гніе. Таксама з’яўляецца персаніфікацыяй празмернай гордасці [1, с. 417].

У беларускім традыцыйным культурным полі паўлін мае станоўчую канатацыю. Гэта райская птушка, ён часта сустаркацца ў маляваных дыванах з райскім сюжэтам (у кампаніі іншых персанажаў). С прыгожым самцом паўліна, што мае доўгі хвост і чубок параўноўваюць у беларускім вусным фальклоры ментавіта дзяўчын («ідзе як пава» і інш.).

Вобраз папугая мае менш сакральную семантыку. У культурах Індыі і Паўночнай Амерыкі ён успрымаўся як пасрэднік паміж двумя сусветамі: боскім і людскім, бо ўмеў пераймаць з мовы чалавека. Лічыцца, што гэтая птушка можа дапамагчы выклікаць дождж, а гэта спрыяе плоднасці. У выяўленчых матывах беларускага народнага мастацтва, гэта адзін з персанажаў «маляванага раю», бо ўспрымаецца як жывёла надзвычай экзатычная, незвычайнага выгляду. Менавіта з варыяцыямі знешняга выгляду папугаяў інсітныя мастакі найбольш экспераментуюць, “складаючы” яго аблічча з элементаў вядомых ім птушак (напрыклад, дзюба і кіпцюры драпежных каршуноў і г.д.). У пасляваенны час у інтэр’еры матывы з экзатычнымі і яскравымі шматколернымі папугаямі сімвалізавалі вяртанне да мірнага жыцця, мелі пераважана эстэтычную функцыю і дапамагалі сялянскай хаце набліжацца да аздаблення гарадскога жылля. У гэтым рэчышчы нельга не ўзгадаць і той факт, што

папугай з’яўляецца характэрным персанажам насценных роспісаў, габеленаў, фарфору эпохі ракако з яе модай на арыенталізм. Ракако, як інтэр’ерны стыль палацаў і рэзідэнцый, мог пэўным чынам трансфармавацца ў сімвалічнае імкненне да «палацавасці» у часы пасляваеннага аднаўленне краіны.

Паступова, бліжэй да 1970-х гг. сакральна-магічная функцыя выяў ўсходніх экзатычных птушак паступова страчваецца і пачынае дамінаваць эстэтычны пачатак.

Матывы з паўлінам узгадваюцца як выкананыя на замову на маляваных дыванах, як роспіс на шкле, радзей, як роспіс на сценах хаты. Паўлін мог адлюстроўвацца як галоўны персанаж кампзіцыі, а мог, у складзе райскага сюжэту разам з іншымі жывёламі. Што датычыцца выявы папугая, то найчасцей ён сустракаецца ў вышыўцы. Пераважна, гэта асноўны персанаж кампазіцыі, радзей ўваходзіць у склад жыхароў раю на маляваных дыванах. Сустракаецца выява папугая і ў роспісу на шкле, але прататыпам у дадзеных выпадаках з’яўляюцца схемы для вышыўкі крыжыкам і іншая друкаваная прадукцыя.

Прыклады выявы папугая ў райскім садзе мы можам знайсці ў маляваных дыванах знакамітай народнай мастачкі Алены Кіш. Папугай, у яе інтэрпрэтацыі, не мае стракатага пер’я, а больш падобны на птушку-драпежніка з магутнымі кіпцюрамі.

У творах іншай інсітнай мастачкі Ніны Бохан (дастаткова нядаўна адкрытае імя) выявы паўліна сустракаюцца ў створаных ёй насценных роспісах сельскіх хат (напрыклад, у хаце Галіны Вяршковіч у в.Сяльцы, Сінькоўскі сельсавет, Смаргонскі район). Журналіст, даследчык творчасці мастачкі распавядае: «У Сяльцы, у хаце 85-гадовай Галіны Вяршковіч, чакаў сапраўдны скарб: карціны, якія малявала Ніна Бохан на сценах. Выява трох волатаў, памерам 135х115 см, паверх якой павесілі сучасны дыван. Дзве іншыя – заклеілі шпалерамі. Тым не менш гаспадыня, убачыўшы зацікаўленасць да насценных малюнкаў, дазволіла нам іх “адкрыць” – зняць шпалеры. А пад імі… на адной сцяне – казачныя павы (паўліны) на ярка-блакітным фоне. На другой – плывуць лебедзі» [2].

У экспазіцыі выставы “Відзікі: беларускі традыцыйны поспіс на шкле” ў галерэі «Цэнтр» дзяржаўнай установы «Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці» быў прадстаўлены твор Іосіфа Мысліцкага з паўлінам з прыватнай калекцыі краязнаўцы Наталлі Плаксы. Вядома, што гэта быў вельмі папулярны матыў, які народны майстар ствараў на замову для жыхароў ваколіц Нясвіжу. Экзатычнасці матыву дадае фон, які складаецца з перацякаючых рознакаляровых гарызантальных сегментаў блакітнага, жоўтага, фіялетавага колераў. Птушка размешчана на

падковападобнай кампазіцыі з кветак: ружы, белыя рамонкі (мае кампазіцынае падабенства са схемамі вышыўкі).

Таксама неабходна ўзгадаць і работу Алены Макоўчык з паўлінам на светлым фоне (знойдзена ў в. Совіна, Бярозаўскі р-н, Брэсцкая вобл., захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, калекцыя «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва»). Чыстыя фарбы, лаканічная кампазіцыя са сціплай галінкай кветак, скіроўвае ўвагу гледача менавіта да птушкі, галоўным дэкорам якой з'яўляецца выразны хвост.

Таксама на дадзенай выставе прадстаўлены краявід мастачкі Ганны Марчэня «Кветкі і паўлін», 1950-е гг. (знойдзены ў в. Мышковічы, Бярозаўскі р-н., Брэсцкая вобл., захоўваецца ў Бярозаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі), у кампазіцыі якога выява паўліна вынесена на першы план — ён сядзіць на плоце, за ім садочак з кветкамі, дамок у атачэнні дрэў, блакітнае неба з сонейкам, па якім ляцяць самалёты чорнага колеру. Гэты «відзік» яскрава сімвалізуе імкненне народных мастакоў да адлюстравання ідэальнага свету, у нечым набліжанага да раю, але, які існуе на зямлі. І выява паўліна дапамагае ствараць гэтую шчырую ідылічную візуальную гісторыю.

У экспазіцыю галерэі «Цэнтр» трапіў цікавы экспанат, які быў створаны Васілём Калініным, і захоўваецца ў фондах літаратурна-краязнаўчага музея «Спадчына» сярэдняй школы в. Дамачава, Брэсцкі район. Гэта папугай у акаленні падковападобнай кампазіцыі з кветак. Стылістычна і каларыстычна праца адрозніваецца ад іншых твораў Васіля Калініна: расшыраны набор фарбы, пластычная мова выбудоўваецца плямамі з прыступчатымі абрысамі.

Тлумачэнне гэтаму твору, а таксама адказ аб першакрыніцах (прататыпах) інтэр'ерных вышывак з экспазіцыі Мотальскага музея народнай творчасці нам дае прадукцыя Тыпаграфіі імя Сталіна з г Мінска.

На гэтым прадпрыемстве ў пасляваенны час быў распачаты выпуск схем для вышывак, якія прадаваліся асобнымі аркушамі. Дадзеныя схемы былі прызначаны для інтэр'ерных пано і мелі адпаведны памер (часцей за ўсё 54x34 см.). Яны выходзілі значынымі тыражамі ад 5000 да 60000 экзэмпляраў, каштавалі 2 рублі за аркуш. Памер тыражу вызначаўся папулярнасцю сюжэта. Найбольш папулярнымі лічыліся своеасаблівыя "рэпрадукцыі" з жывапісных твораў («Тры багатыры», «Алёнушка» В.Васнецова, «Раніца ў сасновым лесе» І.Шышкіна і інш). Схема, з разглядаемым папугаем, з роспісу Васіля Калініна была надрукавана ў 1956 г. тыражом у 30000.

На дадзены момант імёны мастакоў, якія распрацоўвалі малюнкі для схем не высветлены. Многія сюжэты з экзатычным птушкамі з'яўляюцца варыяцыямі заходнеўрапейскіх вышывак XIX ст. Дадзеная друкаваная

прадукцыя была вельмі запатрабаванай і распаўсюджвалася далёка за межы беларускай рэспублікі. Сучасныя расійскія даследчыкі інтэр’ернай вышыўкі Е.А.Раманава, Т.Ю.Ларына фіксуюць вышытыя пано з гэтым матывам ў Алтайскім краі і Усходне-Казахстанскай вобласці [3, 4]. На беларускай тэрыторыі ён атрымоўвае папулярнасць і ў якасці прататыпа і для вышыўкі, і для роспісу на шкле. Майстры таксама часта робяць копіі з твораў “калег”, якія спадабаліся, а не з папяровых схем. Трэба адзначыць, што і ў вышыўцы, і ў роспісу на шкле народныя майстры дазвалялі сабе значную долю інтэрпрэтацыі, асабліва ў колерах кветак і пер’я папугая, у варыяцыях фона (у перашкрыніцы ён быў часта чорны).

Акрамя Тыпаграфіі імя Сталіна ў г. Мінску схемы для вышыўкі выпускалі іншыя тыпаграфіі (у Маскве, Ленінградзе) і арцелі савецкага саюза (напрыклад, арцель «Инбумажник» г.Адэса). «…калекцыянеры налічваюць іх больш 600 штук з разнастайнымі сюжэтамі. Многія з іх скапіраваны з берлінскіх малюнкаў» [3, с. 150]. Крыніцай, дзе народныя майстры маглі “падглядзіць” малюнак з матывам папугая былі і савецкія часопісы для жанчын, такія як «Крестьянка», «Работница», «Советская женщина» [3, с. 157].

У экспазіцыі Мотальскага музея народнай творчасці захоўваюцца інтэр’ерныя вышыўкі 1950-1960-х гг. Відавочна, што мясцовым майстрыцам падабаліся сюжэты з выявай папугая, які сядзіць на галінке ружы (часам з дадаткам іншых кветак, лістоўя пальмы). Падобныя сюжэты былі абраны М.Ф.Жыховіч, В.Г.Мацукевіч, Н.Ф.Жук з в. Моталь. Арыгінальнай кампазіцыяй ў набліжанай да народнай стылістыцы адрозніваюцца вышыўкі гладдзю А.Н. Кананові з в. Хатынічы: парная выява экзатычных птушак, падобных адначасова на папугаяў і паўлінаў (вышыўка гладдзю, кампазіцыя ўпісваецца ў ромб, куты якога маркіраваны 4-ма кветкамі), або адна птушка з чырвоным пер’ем і зялёнай галавой, у разамкнёным вянку з кветак, ёсць у гэтага аўтара і вышыўкі крыжыкам па друкаваным схемам.

Для вышытых панно з Моталя характэрны белы або шэры (колер натуральнай ільняной тканіны) фон і вельмі насычаныя, яскравыя, з разнастайнымі адценнямі колеры нітак. Гэты факт мае сувязь з гісторыяй мястэчка: вядома, што мясцовае габрэйскае насельніцтва гандлявала фарбавальнікамі для тканініны і нітак, што адбілася на каларыстыцы мотыльскага строю.

На сённяшні час, творы народнага мастацтва з выявамі ўсходніх экзатычных птушак маюць вялікую этнаграфічную каштоўнасць і адлюстроўваюць шляхі сінтэзу культур у 1930-1960-я гг.: народнай і гарадской, усходняй і заходняй. Дэкаратыўныя пано, выкананыя пры дапамозе вышыўкі або роспісу на шкле, ўстаўлялі ў самаробныя рамы і

размяшчалі на сцяне як карціны, маляваныя дываны з райскімі сюжэтамі, у якія ўваходзілі выявы папугаяў або паўлінаў размяшчалі часцей за ўсё над ложкам, бо яны захоўвалі свае апатрапейныя функцыі. Матывы з выявамі экзатычных усходніх птушак з'яўляюцца цікавымі прадуктамі з'явы масавай моды, якая трапіла пад народную асіміляцыю.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Холл Дж.* Словарь сюжетов и символов в искусстве // пер. с англ. Е.А.Майкапара. М. : КРОНН-ПРЕСС, 1996.

2. *Антонава Г.* Ніна Бохан: самабытная мастачка, якая малявала дываны і грошы [Электроны рэсурс] // Светлы шлях. URL : https://www.shliah.by/news/kultura/news18337.html (дата обращения : 05.05.2023).

3. *Ларина Т.Ю.* Развитие вышивки полиэтничного населения Алтая в конце XVIII – втором десятилетии XXI века : дис. … кандидата культурологии по специальности 24.00.01. Алтайский государственный институт культуры. Барнаул, 2012.

4. *Романова Е.А.* Жанровая настенная вышивка XX века на территории Восточно-Казахстанской области (на основе фондовой коллекции ВК областного архитектурно-этнографического и природно-ландшафтного музея-заповедника) // Россия, Сибирь и государства Центральной Азии: взаимодействие народов и культур [Электронный ресурс]: материалы VI международной научно-практической конференции, г. Барнаул, 27-28 апреля 2016 года / под ред. В.А. Бармина. Барнаул: АлтГПУ, 2016. С. 122–125. URL : https://vkoem.kz/index.php/ru/2010-03-09-08-54-46/85-2010-03-09-10-07-22/2161-romanova-zhanrovaya-nastennaya-vyshivka-xx-veka-na-territorii-vostochno-kazaxstanskoj-oblasti-na-osnove-fondovoj-kollekczii-vk-oblastnogo-arxitekturno-etnograficheskogo-i-prirodno-landshaftnogo-muzeya-zapovednika (дата обращения : 05.05.2023).